# Выстаўка, прысвечаная 35-годдзю літаратурнай дзейнасці Янкі Купалы

У галоўным чытальным зале Беларускай дзяржаўнай бібліятэкі імені Леніна ў Мінску адкрылася вялікая літаратурная выстаўка, прысвечаная 35-годдзю літаратурнай дзейнасці народнага паэта БССР ордэнаносца Янкі Купалы. У шматлікай літаратуры, фотаздымках, якія экспаніруюцца на выстаўцы, ярка адлюстравана жыццё і дзейнасць паэта.

Вялікую цікавасць прадстаўляе раздзел, прысвечаны дарэвалюцыйнай літаратурнай дзейнасці паэта. Тут паказан першы твор Я. Купалы—«Мужык», які быў надрукаван у 1905 г. у газеце «Северо-западный край», рукапісы асобных твораў паэта—«Да свайго народа», «Песня аб сіроцкай долі» і іншыя, а таксама аўтарская карэктура кнігі «Шляхам жыцця».

Спецыяльны аддзел прысвечан росквіту літаратурнай дзейнасці паэта пасля Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі. Багата прадстаўлены творы, выданыя за годы совецкай улады.

У раздзеле «Купала як перакладчык» знаходзяцца творы Некрасава, Пушкіна, Шэўчэнкі, Міцкевіча, якія паэт пераклаў на беларускую мову.

Спецыяльны раздзел прысвечан творам паэта для дзяцей.

Жыццёвы шлях і дзейнасць паэта адлюстраваны ў шматлікіх здымках, выстаўленых у спецыяльнай фотавітрыне. Тут паказаны бацькі паэта, паэт у дзяцінстве, Я. Купала сярод пісьменнікаў і т. д. Вялікую цікавасць прадстаўляюць таксама экспаніруемыя на выстаўцы выказванне вялікага рускага пісьменніка М. Горкага аб паэту, прывітанне Янку Купале ў сувязі з яго 25-годдзем літаратурнай дзейнасці ад газеты «Правда», Фелікса Кона, Сулеймана Стальскага і іншых.

Выстаўка карыстаецца вялікім поспехам у працоўных сталіцы БССР.